**Лазюк, А.** У Афгане сустрэў земляка / А. У. Лазюк // Голас Сенненшчыны. — 2011. — 15 лют. — С. 2.

## У АФГАНЕ СУСТРЭЎ ЗЕМЛЯКА



Сёння ў Беларусі адзначаецца Дзень памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў. Амаль 10 гадоў, са снежня 1979 года па люты 1989, маладыя хлопцы ў ваеннай форме салдат і афіцэраў Савецкай Арміі знаходзіліся ў краіне, дзе і зараз няма спакою, прымалі ўдзел у ваенных дзеяннях, спрабавалі прымірыць мясцовых праціўнікаў, нешта будавалі.

Міхаіл Паляшкевіч, жыхар вёскі Перакопава, таксама служыў у Афганістане. А прызываўся ён на тэрміновую службу ў войска з Полымя. Спачатку служба праходзіла ў Джамбуле, што ў Казахстане. Тут знаходзіўся ваенны аэрадром, дзе базіраваліся верталёты і праходзілі падрыхтоўку маладыя лётчыкі з многіх краін свету, з якімі ў СССР былі сяброўскія ўзаемаадносіны.

– На нашым аэрадроме можна было сустрэць неграў, прадстаўнікоў азіяцкай расы, – успамінае Міхаіл Паляшкевіч. – У час службы – быў вадзіцелем транспартнага ЗІЛа, камандзірам аддзялення. Як толькі савецкія войскі ўвайшлі ў Афганістан, нас таксама накіравалі туды.

Частка машын ішла сваім ходам, частку перакінулі па паветры. За мяжой салдаты займаліся тым, што і ў Саюзе – забяспечвалі дзейнасць верталётнага палка. Толькі ўмовы для абслугоўваючага персаналу і лётчыкаў сталі іншымі – баявымі. Зразумела, у горы вадзіцелям аэрадромнай службы хадзіць не даводзілася. А вось псіхалагічнае напружанне прысутнічапа пастаянна. Верталёты вярталіся з заданняў пашкамутаныя, нярэдка дастаўлялі параненых ці забітых. Неяк у суседняй часці за ноч прапала некалькі салдат. Праз некаторы час іх галовы знайшлі ў рацэ. Таму да нясення каравульнай службы ставіліся вельмі адказна.

– Смак вады, у якой заварвалі вярблюджыя калючкі, помню да гэтага часу, – усміхаецца мой субяседнік. – Такім чынам мы ратаваліся ад інфекцыйных захворванняў.

У пісьмах дамоў Міхаіл, зразумела, не пісаў пра асаблівасці службы. Хоць бацькі здагадваліся – на канвертах была пазначана палявая пошта. А тут яшчэ земляка сустрэў, Міхаіла Прышчэпу.

– Летась у раённай газеце пра яго пісалі, – кажа Міхаіл Паляшкевіч. – Ён тады капітанам быў. Водпуск атрымаў, зайшоў у палатку. Смяецца – паехалі разам. Такія моманты афганскай службы таксама не забываюцца.

Дамоў малодшы сяржант Паляшкевіч вярнуўся ў пачату чэрвеня 1980 года. Вучыўся ў Оршы, стаў спецыялістам па абслугоўванні халадзільнага абсталявання. Ажаніўся. Мікалай Лавіцкі, які таксама родам з беліцкіх мясцін, тады працаваў дырэктарам саўгаса ў Ходцах і запрасіў

маладую сям’ю ў гаспадарку. З цягам часу вадзіцель аўтамабіля і наладчык халадзільнага абсталявання перакваліфікаваўся ў асемянатара буйной рагатай жывёлы.

– Мая праца запатрабаваная. Яе вынік залежаць цалкам ад мяне асабіста. І гэта мяне задавальняе, – разважае Міхаіл. – А што да афганскага перыяду жыцця, то ўзгадваю яго я рэдка, толькі тады, калі з’яўляецца нейкая нагода. Успамінаць трэба пра добрае, прыемнае.

**А. Лазюк**

На здымку: Міхаіл Паляшкевіч,
удзельнік вайны ў Афганістане